ния в средствах массовой информации»: Постановление Министерства юстиции Республики Беларусь от 7 апреля 2006 г., № 21: в ред. Постановления Министерства юстиции Республики Беларусь от 15.09.2008 // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «Юр Спектр», Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. Минск, 2012.

Ганна Басава, Вікторыя Пяткевіч
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

АДЛЮСТРАВАННЕ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ У НАЗВАХ РЭЛІГІЙНЫХ СВЯТАЎ

Напэўна, кожнаму чалавеку ўласціва задумацца: адкуль ён паходзіць, што такое жыццё і смерць, хто ці што кіруе яго ўчынкамі і г. д. Часам знаходзяцца і адказы, але не пераканальныя. На дапамогу сталі прыходзіць тыя, хто наладжваў сувязь паміж зямнымі істотамі і вышэйшымі сіламі праз прадметы культу, хрысціянскія, ісламскія і іншыя боствы. Так узнікла рэлігія [4, с. 3]. Функцыянаванне шматлікіх храмаў розных канфесій у Беларусі дазваляе сцвярджаць, што на сёння рэлігія ўвайшла ў жыццё значнай часткі насельнікаў нашай краіны і што грамадства зацікаўленае ў інфармацыйным асвятленні гэтай тэмы. Рэлігійная тэматыка шырока прадстаўлена і на старонках неспецыялізаваных выданняў. Ніводная з канфесій у Рэспубліцы Беларусь не аказвае непасрэднага ўздзеяння на змест перыядычных выданняў, але ж рэлігійны ўплыў на сродкі масавай інфармацыі адчувальны, бо роля духоўнага свету людзей – аб'екта ўздзеяння рэлігіі – ва ўзнаўленні індывідуальнага і грамадскага жыцця не змяншаецца. Рэлігійныя арганізацыі розных канфесій шырока выкарыстоўваюць свецкія сродкі масавай інфармацыі для пашырэння сваіх маральных каштоўнасцей, веравучэння [Тамсама, с. 3].

Штодзённая беларускамоўная грамадска-палітычная газета «Звязда» часта змяшчае галоўныя навіны з рэлігійнай сферы, афіцыйныя звароты духавенства, інтэрв'ю са святарамі, рэпартажы з жыцця вернікаў. Натуральна, што тэматыка падобных публікацый патрабуе выкарыстання спецыфічнай лексікі. Матэрыялы «Звязды» якраз і дазваляюць даследаваць асаблівасці такой лексікі, характэрныя менавіта для беларускай мовы.

Наша даследаванне скіравана на асаблівасці ўжывання асобнай групы рэлігійнай лексікі – назвы хрысціянскіх святаў (*хрысціянскія* мы разумеем як святы, якія адзначаюцца найперш у праваслаўі і

каталіцызме). Менавіта праваслаўе і каталіцызм – тыя канфесіі, якія дамінуюць у Рэспубліцы Беларусь [11]. Гэтым веравызнанням надаецца найбольшая ўвага і ў матэрыялах «Звязды».

Трэба адзначыць, што многія хрысціянскія святы маюць некалькі назваў, інакш *эартонімаў* (для вызначэння паняцця *рэлігійнае свята* выкарыстоўваем тэрмін 'эартонім' (ад грэч. eorte – 'свята'), што значыць 'уласнае імя, якое абазначае царкоўныя святы' [3, с. 219]). Гэта спараджае пэўныя асаблівасці іх ужывання, таму што ў дачыненні да некаторых з найменняў існуе некалькі лексем-адпаведнікаў. У выніку назіраецца з'ява, калі для абазначэння аднаго і таго ж паняцця выкарыстоўваецца больш за адзін тэрмін. В. П. Красней гэты працэс у лінгвістыцы называе полінайменнасцю. Члены полінайменных радоў функцыянальна тоесныя ў тым плане, што арыентуюць на адзін і той жа рэферэнт, а з гэтага вынікае, што паміж імі існуюць семантычна блізкія ці раўназначныя адносіны, гэта значыць адносіны сінанімічнасці або дублетнасці [7, с. 118]. Калі спраектаваць вышэйсказанае ў рэчышча лінгвістычнага асэнсавання назваў рэлігійных святаў, то вынікае наступнае: рэферэнт – гэта само свята, падзея, напамін пра якія і стаў прычынай святкавання; каб назваць пэўнае свята, носьбіт мовы свядома выбірае адно з найменняў, якія з'яўляюцца сінонімамі па сваёй сутнасці. Напрыклад: рэферэнт – Нараджэнне Хрыста, які можна назваць як Ражджаство, Раство, Божае Нараджэнне.

Полінайменнасць у дачыненні да рэлігійных святаў можна вытлумачыць наступнымі акалічнасцямі. «Гэта звязана з тым, – разважае А. Мусорын, – што характэрнай рысай рэлігійнай гісторыі беларускага народа ёсць тое, што беларусы ніколі не былі цалкам праваслаўным народам, як, напрыклад, расейцы, або цалкам каталіцкім, як, напрыклад, палякі. Беларусь заўсёды была поліканфесіянальнай краінай, на абшары якой шмат стагоддзяў узаемадзейнічалі праваслаўная і каталіцкая культурныя традыцыі, што адлюстроўвалася ў тым ліку і ў беларускай тэанімічнай лексіцы, абумовіла яе варыянтнасць паводле канфесіянальнай прыналежнасці» [10, с. 342]. У сучаснай беларускай мове варыянтнасць паводле канфесіянальнай прыналежнасці датычыць і назваў рэлігійных святаў. Звычайна праваслаўны адпаведнік мае царкоўнаславянскія або грэчаскія карані, каталіцкі – лацінскія або польскія. Так, для большасці святаў уласцівыя канфесіянальна маркіраваныя найменні, што важна ўлічваць у публікацыях газеты «Звязда».

Акрамя назваў з выражанай канфесіянальнай аднесенасцю, вылучаюцца і назвы, характэрныя для народнай гаворкі, якія нярэдка маюць язычніцкія карані. У такіх назвах часта адсутнічаюць прыкметы канфесіянальнасці. Гэта звязана з тым, што «ў народнай культуры ўсходнеславянскіх, у тым ліку і беларускага, этнасаў існуе некалькі тыпаў календароў або сістэм вымярэння часу, кожная з якіх мае свае функцыі і сваё культурнае асяроддзе…У тым календары, які захаваўся да пачатку XXI стагоддзя, існавала некалькі сістэм вымярэння і ўпарадкавання часу, якія прынцыпова адрозніваюцца адна ад адной. Самай старажытнай сярод іх з'яўляецца сістэма традыцыйнага народнага летазлічэння, якая цалкам адпавядала стану прыроды і адвечным, нязменным законам космасу. Больш позняга паходжання хрысціянскі каляндар за многія стагоддзі сумеснага існавання зблізіўся з народным у такой ступені, што шэраг асноўных святаў пачалі адзначацца ў адзін і той жа час» [5, с. 10]. Такое збліжэнне можна патлумачыць тым, што немагчыма было ўстанавіць дакладныя даты многіх святаў. Так, архімандрыт Кіпрыян Керн адзначае: «Калі можна без цяжкасцяў устанавіць дату крыжовай смерці Госпада па каляндарных запісах, якія захаваліся, то дзень Раства Хрыстова, Прабражэння і іншыя ніякімі датамі не можа быць устаноўлены. … Каб устанавіць дакладныя даты святкаванняў, Царква нярэдка кіравалася сваімі асаблівымі, так бы мовіць «педагагічнымі» ці місіянерскімі меркаваннямі. Фіксуючы канкрэтны дзень як свята, Царква імкнулася пераадольваць мясцовыя традыцыі, перажыткі папярэдніх рэлігійных звычаяў і інш.» [6]. У эарталагічным эцюдзе «Михайлов день» В. В. Болатаў аргументуе такія дзеянні Царквы: «Язычніцтва, з якім вядзе барацьбу Царква, – гэта не толькі рэлігія, але і складзены пэўным чынам побыт. Даказаць язычніку безгрунтоўнасць яго ўяўленняў пра багоў і ўпэўніць яго верыць у хрысціянскага Бога значыла зрабіць шмат, але не ўсё. Хрысціянін, які яшчэ нядаўна быў язычнікам, не мог перапыніць зносіны са сваімі суседзямі. Патрэбна было захоўваць яго ад рэцыдыву, і святы адыгрывалі тут ці не галоўную ролю» [2, с. 621]. Устанаўленне ў дні язычніцкіх святкаванняў хрысціянскіх святаў было матывавана тым, што ў дзень язычніцкага свята хрысціяне ішлі ў храм, а пасля літургіі псіхалагічна цяжка было ўдзельнічаць у язычніцкіх оргіях. В. В. Болатаў акцэнтуе ўвагу на тым, што «па меры ўкаранення хрысціянства язычніцтва пераставала быць рэлігійнаю сілаю: яно жыло па інерцыі, прывыкнуўшы да канкрэтных бытавых форм, і Царква, для таго, каб хрысціянства распаўсюджвалася больш па-

спяхова, па магчымасці старалася літаваць гэтыя звычаі, калі ў іх закладзена была чалавечая душа, калі політэізм гэтых звычаяў абмяжоўваўся знешнімі праявамі» [Тамсама, с. 624]. Адсюль вынікае, што ранняе хрысціянства не мела на мэце выкараняць старадаўнія назвы святаў.

У сувязі з гэтым існуюць два календары: *народны*, у аснове якога – рух сонца на небасхіле (яго структуру складаюць такія святы, як Каляды, Грамніцы, Вялікдзень, Сёмуха і інш.), і *хрысціянскі,* які з'явіўся пасля хрышчэння ў 988 годзе. У аснове апошняга - найбольш важныя падзеі ў жыцці Ісуса Хрыста і яго маці Дзевы Марыі (напрыклад, Раство Хрыстова, Стрэчанне, Уваскрасенне). Усё гэта прывяло да таго, што ў II тысячагоддзі ў славянскім духоўным свеце разгарнуўся працэс, які прывёў да ўзнікнення надзвычай спецыфічнай з'явы, якую сёння называюць *двухвер'е*. Адаптаваная ў народнай свядомасці новая вера атрымала назву *народнае праваслаўе*. Структурны і зместавы аналіз календара паказвае, што галоўныя падзеі хрысціянскай царквы і станаўленне самога хрысціянства былі тонка і дакладна суаднесены з папярэднім абрадавым календаром усходнеславянскіх народаў [5, с. 14].

Такім чынам, у дачыненні да аднаго рэлігійнага свята існуе некалькі назваў, якія маюць рознае паходжанне (праваслаўнае, каталіцкае ці народнае) і ўтвараюць сінанімічны рад. Прыкладам сінанімічнасці з'яўляюцца найменні трох жнівеньскіх святаў, прысвечаных Спасу, ніводнае з якіх не мае фіксаванай назвы ў газеце «Звязда».

Першае свята: **Вынясенне слаўных дрэў Жыватворнага Крыжа Гасподняга – першы (мядовы, мокры, макавы) Спас – Макавей.**

14 жніўня Праваслаўная Царква адзначае свята вынясення слаўных дрэў Жыватворнага Крыжа Гасподняга. Тлумачэнне найменню свята даецца ў Беларускім праваслаўным календары са спасылкай на грэчаскі часаслоў: «Па прычыне хваробаў, якія часта распачынаюцца ў жніўні, здаўна ўсталяваўся ў Канстанцінопалі звычай выносіць з царскай скарбніцы слаўнае дрэва Крыжа на дарогі і вуліцы для асвячэння месцаў і прадухілення хваробаў» [1, с. 61]. Зараз крыж выносяць не на вуліцу, а ў цэнтр храма. Назва свята супадае з дзеяннем і складаецца з шасці слоў. У газеце «Звязда» гэтая назва намі не выяўлена, што, на нашу думку, тлумачыцца яе шматкампанентнасцю і нязручнасцю выкарыстання.

Больш распаўсюджаная назва гэтага свята – *Спас*. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы вызначае паходжанне наймення ад

стараславянскага **съпасъ,** якое, у сваю чаргу, утварылася ад **съпасти,** што значыць ‘берагчы, ратаваць’. У старабеларускай мове лексема *Спас* значыць ‘Збавіцель, Хрыстос’. Адпаведна ў сучаснай беларускай мове *Спас* – гэта ‘Збавіцель, адна з назваў Хрыста’ (такое азначэнне падаецца ў Тлумачальным слоўніку беларускай мовы [13, с. 251]), якая выкарыстоўваецца як сінонім да асноўнай – Ісус Хрыстос. Вядома, што лексема *Спас* у значэнні ‘Ісус Хрыстос’ лічыцца прымальнай у праваслаўным ужытку. Так, у Беларускім праваслаўным календары пазначана, што Праваслаўная Царква 14 жніўня адзначае яшчэ і святкаванне Усяміласціваму *Спасу* і Прасвятой Багародзіцы [1, с. 61], а 19 жніўня – Праабражэнне Госпада Бога і *Спаса* нашага Ісуса Хрыста [Тамсама, с. 62]. Адсюль і вынікае, што другая назва свята, якое адзначаецца 14 жніўня, – *першы Спас* (першы, таму што ёсць яшчэ другі і трэці) мае хрысціянскае паходжанне. Фалькларыст Я. Крук сцвярджае: «У народным календары ёсць тры святы [гаворка ідзе пра Спасы], якія стаяць побач і запазычаны з царкоўнага календара» [8, с. 176].

Разам з тым узнікае пытанне: першы Спас называюць таксама макавым, мокрым, мядовым. Адсюль – супярэчлівае спалучэнне, калі лексему *Спас* замяніць на яе сінонім – *Хрыстос.* У сувязі з гэтым У. Сысоў выказвае меркаванне, што «ў язычніцкай рэлігіі Спас – гэта бажаство, якое ўвасобіла ў сабе Духа ўраджаю, а магчыма, што нават узначальвала цэлы пантэон Духаў поля, лесу лугу і г. д.» [12, с. 197]. Як доказ гэтаму – выкарыстанне слова *Спас* ў беларускім фальклоры: «Святый Спас, памілуй нас!..», «Святы Іспас – старэнькі дзядок, на восець садзіў, жыта малаціў…», «Святы Спас едзець у поле ды зямельку мяшаець, прыгатаўляець…» [Тамсама, с. 197–198]. Раней жыццё людзей было цалкам прасякнута сельскагаспадарчымі клопатамі. Хлебаробы малілі духаў і багоў аб добрым ураджаі, а калі ён паспяваў, то селянін прыносіў Спасу свае ахвяраванні з новага ўраджаю ў якасці падзякі.

Пазней ідэі хрысціянства напластаваліся на язычніцкія святы ў гонар Спаса. Так, 14 жніўня ў храмах асвячаюць мёд, мак і ваду. Адпаведна і Спас стаў мядовым, макавым ці мокрым. Як бачым, канатацыя гэтых назваў даволі насычаная, бо ўбірае ў сябе як рэлігійную, так і язычніцкую семантыку. Чытачу лёгка ўсвядоміць сэнс свята (хаця б знешні, рытуальны), бо азначэнне да яго назвы ўказвае на тое, што асвячаецца царквой у гэты дзень. Гэтым тлумачыцца той факт, што кананічная назва – *Вынясенне слаўных дрэў Жыватворнага Крыжа Гасподняга* – не ўжываецца на старонках «Звязды», а найменне *Спас* з рознымі дапасаванымі да яго

азначэннямі вельмі пашырана: *Традыцыйна на* ***Мядовы Спас*** *адбываецца асвячэнне жыватворнай крыніцы (2011. 16 жн.);* ***Спас*** *у зёлкавай карчме. Роўна год таму, якраз на праваслаўнага* ***Спаса****, у вёсцы Камуна Любанскага раёна з'явілася зёлкавая карчма (2010. 19 жн.); Пачынаецца яно [асноўнае, летняе пампаванне мёду], як правіла, на* ***Мядовы Спас*** *(2010. 5 жн.); У мінулыя выхадныя дні сотні людзей паводле старадаўняй традыцыі адзначылі* ***Мядовы Спас*** *на Блакітнай крыніцы ў Слаўгарадскім раёне (2011. 17 жн.); Гэта культавае збудаванне было ўзведзена ў гонар аднаго з хрысціянскіх святаў –* ***Першага (Макавага) Спасу*** *(2009. 18 чэрв.).* Як бачым, найменне *Спас* ужываецца ў дачыненні і да рэлігійнай, і да народнай традыцый.

Трэцяе найменне свята, якое праваслаўныя вернікі адзначаюць 14 жніўня, – *Макавей*. Макавеі – гэта сем святых пакутнікаў, якія пацярпелі за сваю веру пры цары-паганцы Анціёху Епіфане ў 166 годзе да нашай эры. 14 жніўня Праваслаўная Царква адзначае памяць гэтых святых. Таксама найменне Макавей асацыіруецца са старадаўнім звычаем ушанавання маку (мак → Макавей). У гэты дзень у храмах, апрача мёду і вады, асвячаюць мак. Яшчэ адно меркаванне пра паходжанне назвы *Макавей* падаецца ў энцыклапедычным слоўніку «Міфалогія беларусаў»: «У пацвярджэнне назвы на Віцебшчыне кожнай гаспадыні трэба было прыгатаваць хоць бы адну страву, якую можна мачаць (бліны, напрыклад). Пчаляры здабывалі мёд, каб мачаць у яго агуркі і хлеб» [9, с. 290]. Тут таксама прасочваецца лагічная сувязь: мачаць → Макавей. Такім чынам, найменне *Макавей*, як і найменне *Спас*, можа мець два спосабы тлумачэння: хрысціянскі і народны.

Лексема *Макавей* часта сустракаецца і на старонках «Звязды»: *На* ***Макавея*** *багата людзей прыехала ў вёску Стары Дзедзін, што ў Клімавіцкім раёне (2011. 16 жн.);* ***Макавей*** *— свята агародаў, крыніц і пчальнікоў. А ў Буда-Кашалёве ці вёсцы Гута Рагачоўскага раёна на агародах расце, вядома, не адна морква, але менавіта ёю сімвалізуецца мясцовы* ***Макавей*** *(2010. 14 жн.); Тут заўсёды на* ***Макавея*** *да вады не падступіцца. Зусім не хочацца задавацца пытаннем, хто і калі пачаў ладзіць фэсты ля крыніцы менавіта на* ***Макавея*** *і чаму гэтак імкнуцца людзі за Сож, у выселеную з-за Чарнобыля зямлю (2010. 13 жн.).*

Такім чынам, у газетных тэкстах пад словам *Макавей* маецца на ўвазе народнае тлумачэнне, якое асацыіруецца з абрадавымі дзеяннямі, традыцыйнымі ў гэты дзень. Кантэкст ужывання гэтага слова звязаны не з духоўнымі асновамі, а са знешнімі рытуаламі, пэўнымі дзеяннямі, што адбываюцца ў царкве.

Другое свята, прысвечанае Спасу, беларусы адзначаюць 19 жніўня і называюць **Праабражэнне Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста** або **другі (яблычны) Спас.** Адно з самых вялікіх святаў – *Праабражэнне Гасподняе* – так называецца, таму што незадоўга да сваіх пакутаў Ісус Хрыстос разам з трыма вучнямі Іакавам, Іаанам і Пятром узышоў памаліцца на Фаворскую гару. Пакуль Збавіцель маліўся, вучні заснулі, а калі прачнуліся, то ўбачылі Хрыста ў велічы і славе: твар Яго ззяў, як сонца, і нават вопратка стала белая і зіхатлівая. Так, лексема *Праабражэнне* запазычана з царкоўнаславянкай мовы, нагадвае пра біблейскую падзею, азначае 'перамяненне, перайначванне' [14, с. 359] і ўжываецца менавіта ў адносінах да царкоўнага свята: *Праваслаўная царква адзначае сёння адзін з 12 найвялікшых святаў хрысціянства –* ***Праабражэнне Гасподняе*** *(2010. 19 жн.); Сярод праваслаўных храмаў і прыходаў Беларусі амаль 70 асвечаны ў гонар свята, якое 19 жніўня адзначалі як прастольнае –* ***Праабражэння Гасподняга*** *(2007. 21 жн.); Святкаванне Дня беларускага пісьменства ў Смаргоні 6 верасня адкрые Боская літургія ў Саборы* ***Праабражэння Гасподняга*** *(2009. 15 жн.).* У «Звяздзе» гэты эартонім ужываецца ў матэрыялах, дзе гаворка ідзе пра ўласна царкоўныя традыцыі.

Акрамя таго, 19 жніўня нашыя продкі адзначалі свята садавіны, таму замест наймення *Праабражэнне* ў «Звяздзе» часцей ужываецца назва *яблычны Спас*. Гэтым летнім днём беларусы асвячаюць яблыкі ды іншую садавіну ў храмах і ўспамінаюць народныя традыцыі, звязаныя з яблычным Спасам: *Асвячэнне яблыкаў ва ўсіх храмах Беларусі прайшло ўчора – праваслаўныя вернікі адсвяткавалі* ***Яблычны Спас*** *(2011. 20 жн.); Штогод 19 жніўня, на* ***Яблычны Спас****, на Спаскую крыніцу ў Майск збіраецца народ (2010. 21 жн.); Беларускія «зоркі» адзначалі* ***Яблычны спас*** *на сучасны лад (2008. 22 жн.); Таму, калі спявачка, прадзюсар і гаспадыня ўласнага святочнага бюро Ларыса Грыбалёва прапанавала калегам-артыстам і прадстаўнікам бізнэс-эліты сабрацца, каб адзначыць* ***Яблычны спас****, ідэя знайшла, што называецца, водгук у масах (2008. 22 жн.); Для моладзі на* ***Яблычны спас*** *існавала асобная традыцыя — загадваць жаданні (2008. 22 жн.).* Паходжанне лексемы *Спас* (і народнае, і хрысціянскае) пашырае кантэкст яе выкарыстання.

Завяршаецца цыкл святаў у гонар Спаса 29 жніўня згодна з праваслаўнай традыцыяй **Перанясеннем з Эдэсы ў Канстанцінопаль Нерукатворнага Вобраза Госпада Ісуса Хрыста**

ці **трэцім (арэхавым, хлебным, палатняным) Спасам.** Падчас пропаведзі ў сірыйскім горадзе Эдэса Збавіцель абцёр твар ручніком, на якім пасля адлюстравалася Яго Божае Аблічча. Гэты ручнік прынеслі тагачаснаму цару Эдэсы Аўгару для цудадзейнага пазбаўлення ад невылечнай хваробы. Доўга Нерукатворны Вобраз захоўваўся ў Эдэсе, але, пасля захопу горада арабамі, візантыйскі імператар у 944 годзе перанёс яго ў Канстанцінопаль. Як бачым, назва дакладна акрэслівае дзеянні, якія паслужылі прычынай святкавання гэтай даты. Такое найменне досыць шматслоўнае для неспецыялізаванай перыёдыкі, таму намі выяўлены толькі рэдукаваны варыянт наймення: *29 жніўня адзначаецца* ***Перанясенне Нерукатворнага вобраза Ісуса Хрыста*** *(2011. 20 жн.); Сёння –* ***Трэці Спас (Малы Спас, Нерукатворны вобраз, Палатняны Спас, Хлебны, Арэхавы).*** *Праваслаўная царква адзначае ў гэты дзень свята ў гонар перанясення ў Канстанцінопаль Нерукатворнага вобраза Ісуса Хрыста ў 944 годзе. У народзе* ***Палатняным*** *яго называюць таму, што ў гэты дзень адбываліся кірмашы і гандлявалі палатном (2008. 29 жн.).* З прыведзеных прыкладаў відаць, што свята, якое адзначаюць 29 жніўня, называюць яшчэ *арэхавым* (у гэты дзень асвячаюць арэхі), *хлебным* (напрыканцы жніўня раней былі дажынкі – у храм прыносілі хлеб з новага ўраджаю), *палатняным*.

На падставе прааналізаванага фактычнага матэрыялу можна зрабіць наступныя высновы:

Полінайменнасць рэлігійных святаў – характэрная для беларусаў і беларускай мовы з'ява, і гэта адлюстроўваецца у перыядычных выданнях.

У беларускамоўным ужытку рэлігійныя святы маюць не менш за тры спосабы намінацыі (з праваслаўнага, каталіцкага і народнага гледжання). Назвы, утвораныя паводле народнай традыцыі, не суадносяцца з пэўнай канфесіяй і зразумелыя для большасці беларусаў, што спрыяе частотнасці іх ужывання на старонках «Звязды».

У газеце «Звязда» ўжываюцца ўсе існуючыя найменні святаў, што абумоўлена неспецыялізаванасцю выдання. Тым не менш было выяўлена, што розныя назвы аднаго і таго ж свята часцей за ўсё не з'яўляюцца лексічнымі дублетамі. І кожнае з гэтых найменняў мае адметную функцыянальна-стылістычную афарбоўку і ўласную сферу выкарыстання. Таму можна гаварыць пра асаблівасці выкарыстання назваў рэлігійных святаў у выданні.

Такім чынам, полінайменнасць рэлігійных святаў – натуральная з'ява, якая ўзбагачае лексічны склад беларускай мовы і

сведчыць пра моцныя духоўныя традыцыі беларусаў. Праз разнастайнасць назваў рэлігійных святаў перадаюцца самыя глыбокія здабыткі народа, назапашаныя на працягу тысячагоддзяў.

Літаратура

1. Беларускі Праваслаўны каляндар 1996. Звод імёнаў святых. Полацкая епархія / уклад. Т. А. Матрунчык, Г. М. Шэйкін. – Мінск : Свята-Петра-Паўлаўскі сабор г. Мінска, Беларускае Праваслаўнае Братства Трох Віленскіх Мучанікаў, 1996. – 144 с.

2. Болотов, В. В. Михайлов день. Эортологический этюд / В. В. Болотов // Христианское чтение. – Вып. 9–12. 1892. – С. 593–644.

3. Бугаева, И. В. Праздники и их наименование в православном социолекте / И. В. Бугаева // Социальная политика и социология. – М., 2008. – № 1. – С. 218–234.

4. Говін, С. В. Канфесійны друк у Беларусі / С. В. Говін. – Мінск : БДУ, 2008. – 288 с.

5. Катовіч, А. Зімовыя святы : нарысы / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – 119 с.

6. Керн, К. Литургика. Гимнография и эортология / К. Керн [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.kursmda.ru/books/liturgika_gimnografia_k_kern.htm. – Дата доступа : 5.09.2013.

7. Красней, В. П. Беларуская тэрміналогія : зб. арт. / В. П. Красней; рэдкал. : Э. А. Ялоўская (адк. рэд.) і інш. ; навук. рэд. М. Р. Прыгодзіч. – Мінск : БДУ, 2011. – 216 с.

8. Крук, І. І. Следам за сонцам : Беларускі народны каляндар / І. І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

9. Міфалогія беларусаў : энцыклапедычны слоўнік / складальнікі : І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. : Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 605 с.

10. Мусорын, А. Хрысціянская тэанімічная лексіка беларускай мовы праваслаўнага і каталіцкага ўжывання / А. Мусорын // Беларусь і беларусы ў прасторы і часе : зб. да 75-годдзя прафесара Адама Мальдзіса / Грамадскае аб'яднанне «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў», Польскі інстытут у Мінску ; пад рэд. С. Запрудскага, А. Фядуты, З. Шыбекі. – Мінск : Лімарыус, 2007. – С. 342–348.

11. Справка о религиозной ситуации и религиозных организациях в Республике Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.belarus21.by/ru/main_menu/religion/sotr/relig_sit. – Дата доступа : 03.09.2013.

12. Сысоў, У. М. З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 415 с.

13. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 6 т / пад. рэд. К. К. Атраховіча. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1983. – Т. 5. – Кн. 1. – 663 с.

14. Фасмер, Макс. Этимологический словарь русского языка : в 4 т. / Макс Фасмер ; пер. с немецкого и дополнения О. Н. Трубачева ; под ред. и с предисловием Б. А. Ларина. – М. : Прогресс, 1971. – Т. 3 – 828 с.

Людмила Белякова.
Белорусский государственный университет

МЕДИАИНДУСТРИЯ ИНФОРМАЦИОННОЙ ЭРЫ: ТЕНДЕНЦИИ ТРАНСФОРМАЦИИ

Современная медиаиндустрия – это сложная иерархическая структура креативной экономики, обеспечивающая обслуживание во всех уголках земного шара разнообразных возрастающих информационных запросов массовой аудитории – от мала до велика. Печатная периодика (газеты, журналы, альманахи), информационные агентства, радиожурналистика, телевидение, сетевая пресса представляют относительно самостоятельно функционирующие сегменты единой медиасферы, каждый из которых имеет специфику как вид (отрасль) профессиональной журналистской деятельности и ряд общих, особенных и единичных типологических свойств и классификационных характеристик.

Близкие по значению и плохо дифференцируемые в повседневном употреблении понятия – медиаиндустрия, медиасфера, журналистика – отражают различные грани сложнейшей социально-значимой сферы, характеризующие важнейший социальный институт техногенной цивилизации, ответственный за информационное обеспечение и просвещение массовой аудитории. Медиасфера – производное медиаиндустрии, является лишь частью общего, одной из составляющей информационного пространства – сверхсложной кибернетической системы, включающей многочисленные разнообразные социокультурные феномены по производству и распространению информации, в том числе не относящиеся к сфере журналистики (наука, искусство, религия, мода, спорт, дизайн, маркетинг, вербальные и визуальные формы промоушен и пр.).

Формирование информационных ресурсов, их грамотное системное использование на рубеже XX–XXI вв. становятся объектами политических и экономических интриг как на национальном, так и на международном уровнях. Глобальная конкуренция мировых держав за господство на информационном рынке задает стремительный темп развития телекоммуникационных систем и информационных технологий. Интеллектуальная собственность становится символом «новой экономики». Новомодные доктрины